# Алег БАГАМОЛАЎ: «КРОПКІ СУДАКРАНАННЯ ЁСЦЬ»

**Гістарычна склалася, што беларускі і расійскі народы маюць агульныя карані. Абодва народы — славянскія, трымаюцца праваслаўя, маюць агульнае мінулае. У гады існавання Савецкага Саюза вялося актыўнае эканамічнае супрацоўніцтва, паміж арганізацыямі і прадпрыемствамі была цесная кааперацыя. На жаль, з распадам СССР большасць сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і рэгіёнамі Расіі разбурылася. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс дыктуе вострую неабходнасць аднавіць страчанае — наладжваць новыя сувязі, адкрываць рынкі збыту, умацоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Менавіта з гэтай мэтай па запрашэнні прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С. Сідорскага ў Мінск з Расіі прыбыла дэлегацыя Курганскай вобласці на чале з губернатарам Алегам Аляксеевічам Багамолавым, які напярэдадні адказаў на некалькі пытанняў «Звязды».**

**Нагадаем, што Курганскую вобласць многія называюць заўральскім краем, бо гэты рэгіён размешчаны на стыку Урала і Сібіры. Па плошчы ён пераўзыходзіць некаторыя еўрапейскія краіны, а насельніцтва складае каля мільёна чалавек. Галоўным прыродным багаццем Заўралля з'яўляецца ўрадлівая зямля. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць тут больш за 60 працэнтаў плошчы рэгіёна, а пятую частку — лясы. Сёння Курганская вобласць вырабляе ў агульнарасійскім аб'ёме 30 працэнтаў пажарных машын, амаль трэць — антыбіётыкаў, чвэрць — маставых металаканструкцый, 17,5 працэнта аўтобусаў.**



***— Алег Аляксеевіч, і ў Курганскай вобласці, і ў Заўраллі надаюць нямала ўвагі інтэрнацыяналізацыі дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі. Але фінансавы і эканамічны крызіс, безумоўна, не можа не адбіцца на рэалізацыі намечаных планаў міжнароднага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. Як дзейнічаць у такіх умовах?***

— Сённяшнія цяжкасці не павінны прыводзіць да поўнай адмовы ад рэалізацыі сумесных праектаў і развіцця міжрэгіянальнага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Менавіта цяпер сумесная карпатлівая работа, накіраваная на дасягненне канкрэтных вынікаў, набывае асаблівую важнасць. Своечасовае вырашэнне любых узнікаючых пытанняў і дакладнае прытрымліванне дасягнутым дамоўленасцям дазволяць не толькі пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы з мінімальнымі стратамі, але і стварыць усе ўмовы для далейшага развіцця партнёрскіх сувязяў.

***— Як развіваліся адносіны Курганскай вобласці з Рэспублікай Беларусь у апошнія гады?***

— Па выніках мінулага года Беларусь заняла шостае месца па аб'ёме знешнегандлёвага абароту вобласці. У 2009 годзе прадукцыю на беларускі рынак пастаўлялі 15 прадпрыемстваў Курганскай вобласці, пры гэтым вывозілася ў асноўным прадукцыя з закончаным цыклам перапрацоўкі. У прыватнасці, у мінулым годзе заўральскімі прадпрыемствамі экспартаваліся ў Беларусь аўтобусы, лекавыя сродкі, медыцынская тэхніка, помпы, дальныя ўстаноўкі, фібра стальная (металічны напаўняльнік у жалезабетонных сумесях), іголкаролікі, электрамантажныя вырабы, абсталяванне і механічныя прыстасаванні. Адзначу, што па выніках 2007—2009 гадоў найбольш актыўнымі ўдзельнікамі гандлю з беларускімі партнёрамі сталі ТАА «Курганскі аўтобусны завод», ААТ «Сінтэз», які вырабляе прадукцыю медыцынскага прызначэння, ААТ «Катайскі помпавы завод», ААТ «Кургансельмаш» і ЗАТ «Курганстальмост». Для ўмацавання гэтага супрацоўніцтва адміністрацыяй Курганскай вобласці і Міністэрствам знешніх эканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь яшчэ ў верасні 1998 года было заключана Пагадненне аб супрацоўніцтве і дзелавым партнёрстве і падпісаны Пратакол да пагаднення, якія дзейнічаюць і сёння. Падчас цяперашняга візіту мы плануем падпісанне Мемарандума з Урадам Рэспублікі Беларусь аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, а таксама адпаведнага Пратакола мерапрыемстваў на 2010—2011 гады.

***— Што можа прапанаваць Курганская вобласць беларускаму боку?***

— Ва ўмовах фінансавай нестабільнасці мы зацікаўлены ў надзейных партнёрах. Беларусь — стабільная краіна, з добрай дынамікай развіцця, валодае моцнымі прамысловымі галінамі з прагрэсіўнымі вытворчымі традыцыямі, развітой сельскай гаспадаркай, буйным навукова-тэхнічным і кадравым патэнцыялам. У першую чаргу, як мне здаецца, неабходна наладзіць узаемадзеянне ў прамысловасці — наша вобласць мае важкую базу для машынабудавання. Мы многае маглі б прапанаваць беларускаму бізнэсу. Практычна ўсе прадпрыемствы захаваліся і, нягледзячы на крызіс, працягваюць работу. Доля апрацоўчых вытворчасцяў у структуры прамысловасці Курганскай вобласці складае каля 80 працэнтаў і знаходзіцца на ўзроўні эканамічна развітых краін. Асноўны вынік нашай працы — гэта прадукцыя закончанага цыкла вытворчасці: пажарныя машыны, запорная арматура, маставыя канструкцыі і многае іншае, пра што я ўжо сказаў.

Мы зацікаўлены ў абмене інавацыйнымі тэхналогіямі — гэта дазволіць Курганскай вобласці павялічыць аб'ём высокатэхналагічнай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, а беларускім кампаніям — пашырыць рынкі збыту. І тут магчымыя любыя формы супрацоўніцтва, уключаючы стварэнне сумесных прадпрыемстваў як на нашай, так і на беларускай тэрыторыі. Сярод галінаў, якія мы маем намер сур'ёзна развіваць, знаходзіцца наш будаўнічы комплекс. Запрашаем беларускія будаўнічыя кампаніі да нас у Заўралле на будаўніцтва жылля розных катэгорый: ад эканом-класа да элітнага. Магчыма, беларускіх інвестараў зацікавіць распрацоўка сыравінных рэсурсаў для будаўнічага комплексу. У нас ёсць багатыя запасы высакаякасных глін — для вытворчасці цэглы. Ёсць лес, неабходны для будаўніцтва жылля, вырабу мэблі і для іншых патрэбаў.

Я назаву яшчэ турызм. Рэспубліка Беларусь, якая прапануе недарагі і якасны адпачынак на сваёй тэрыторыі, уяўляе пэўны інтарэс для турыстаў з Курганскай вобласці. У тым ліку і ў плане дзіцячага адпачынку. У вас дзейнічае дзевяць дзіцячых санаторыяў, дзе маглі б адпачыць і нашы дзеці, а вашы маглі б пабываць у заўральскіх здраўніцах. Курганская вобласць мае найбагацейшыя прыродныя рэсурсы для паляўнічага і рэкрэацыйнага турызму. У Заўраллі можна паляваць круглы год. З усяго свету да нас прыязджаюць, каб павезці з сабой трафей — сібірскую казулю, якая захавалася толькі ў нашай вобласці. У нашых лясах палююць таксама на лася, ваўка, кабана, барсука, лісу, рысь, куніцу, зайца. Таму запрашаем да нас беларускіх аматараў палявання. У нас — тры тысячы азёраў. Палова з іх — прэсна-водныя, на якіх — цудоўная рыбалка. Ёсць некалькі гразевых азёраў з высокімі лекавымі ўласцівасцямі. Па мінералізацыі яны пераўзыходзяць нават Мёртвае мора ў Ізраілі. Да нас едуць з іншых краін, каб прайсці курс аздараўлення на гэтых азёрах. Мы гатовыя развіваць усе гэтыя накірункі.

Дарэчы, развіццю сферы турызму садзейнічае пагадненне паміж нашымі краінамі, якое забяспечвае роўныя правы грамадзянам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі на свабоду перамяшчэння, выбар месца знаходжання і жыхарства на тэрыторыях дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы, падпісанае 24 студзеня 2006 года ў Санкт-Пецярбургу. Лічым, што гэты механізм дазволіць актывізаваць развіццё турызму на тэрыторыі Беларусі і ў Курганскай вобласці. Хочацца спадзявацца, што дзелавы візіт прадстаўнікоў Курганскай вобласці ў Рэспубліку Беларусь дазволіць умацаваць наша партнёрства, пакладзе пачатак новаму этапу супрацоўніцтва.

***— І ў Расіі, і ў Беларусі істотным чынам мяняецца роля малога і сярэдняга бізнэсу, які павінен стаць своеасаблівай «падушкай бяспекі» для радавых грамадзян нашых краін. Якія сумесныя праграмы супрацоўніцтва ў гэтай сувязі маглі б прапанаваць прадстаўнікам беларускага прадпрымальніцтва малыя і сярэднія прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі Курганскай вобласці?***

— У існуючых умовах прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнэсу Курганскай вобласці асабліва зацікаўлены ў пашырэнні рынку збыту сваёй прадукцыі. За межы Расіі, у тым ліку і ў Беларусь, прадпрымальнікі гатовыя пастаўляць шырокі асартымент тавараў, што вырабляюцца ў Курганскай вобласці. Напрыклад, прадукцыю машынабудавання і металаапрацоўкі, лесаперапрацоўкі, харчовай прамысловасці. Курганская вобласць і Рэспубліка Беларусь традыцыйна арыентаваны на вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі. У Расіі мы займаем дзявятае месца па збожжы, сёмае — па агародніне, па бульбе — 20-е. Менавіта ў гэтай сферы маецца неацэнны вопыт, якім мы гатовыя абмяняцца з беларускімі калегамі.

У сваю чаргу нам неабходныя інвестыцыі ў глыбокую перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі, у тым ліку збожжа, агародніны: кансерваванне, глыбокае замарожванне садавіны. У цяперашні час Курганская вобласць вялікую колькасць гэтай прадукцыі вывозіць у суседнія рэгіёны для наступнай перапрацоўкі. Таму мы гатовыя да супрацоўніцтва з беларускімі кампаніямі не толькі для нарошчвання перапрацоўчых магутнасцяў, але і для распрацоўкі комплекснага падыходу да сельскагаспадарчай галіны Курганскай вобласці.

Ёсць, безумоўна, і праблемы, якія нам яшчэ трэба вырашаць. Возьмем, напрыклад, тыя ж тавары народнага спажывання. Заўральцы добра знаёмыя з беларускай мэбляй, трыкатажам... Тавар добры і недарагі. Але ён для нас мог быць яшчэ больш танным, калі б такімі пастаўкамі займаліся не пасрэднікі, а самі беларускія вытворцы. Праблема? Так. І думаю, што з часам агульнымі намаганнямі мы яе зможам вырашыць.

***— Праграма вашага візіту вельмі насычаная. Якія спадзяванні вы ўскладваеце на гэты візіт? Якія мэты ён праследуе? У якіх канкрэтна сферах, праектах можа развівацца ўзаемнае супрацоўніцтва?***

— Нягледзячы на станоўчую дынаміку гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, мы лічым, што аб'ём двухбаковага дзелавога ўзаемадзеяння з Беларуссю яшчэ не адпавядае патэнцыйным магчымасцям і вобласці, і рэспублікі. Мы зацікаўлены ў павелічэнні ўзаемнага гандлёвага абароту, наладжванні сувязяў паміж нашымі прадпрыемствамі. Патэнцыйныя магчымасці — стварэнне зборачных вытворчасцяў на тэрыторыі Курганскай вобласці, напрыклад, сельгастэхнікі. Заўралле, як я ўжо казаў, гэта — сельскагаспадарчы край, дзе без яе нам ніяк не абысціся. Таму падчас візіту мы наведаем Мінскі трактарны завод, дзе абавязкова будзе ўзнята гэта тэма. У найбліжэйшы час плануецца адкрыццё ў Мінску сэрвіснага цэнтра нашага Катайскага помпавага завода, які будзе займацца абслугоўваннем прадукцыі, якую ён пастаўляе. Будзем рады, калі і ў нас з'явяцца аналагічныя беларускія прадпрыемствы.

Адна з мэтаў візіту — умацаванне культурнага супрацоўніцтва. У Курганскай вобласці пражывае больш як чатыры тысячы беларусаў. Дзейнічае рэгіянальная грамадская арганізацыя беларусаў «Бацькаўшчына», якая падтрымлівае нацыянальныя традыцыі: дзейнічае беларуская школа выхаднога дня, фальклорны калектыў «Жаравачка», ансамбль старадаўняй славянскай песні «Пасядзелкі». Яны з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі абласных фестываляў і гарадскіх святаў, з іх удзелам праходзяць канцэртныя праграмы, прысвечаныя Дню яднання Расіі з Рэспублікай Беларусь. Думаю, мы маглі б супрацоўнічаць і ў сферы культурнага абмену. Мы гатовыя, у сваю чаргу, прыняць прадстаўнікоў беларускіх устаноў культуры і адукацыі ў сябе ў вобласці і будзем рады, калі паступяць аналагічныя прапановы і ад вас.

Нягледзячы на падзеі апошніх гадоў, якія падзялілі нашы краіны ўмоўнымі межамі, застаецца тое, што аб'ядноўвала нас стагоддзямі — агульнасць гістарычных каранёў, моцнае сяброўства і духоўная роднасць народаў Расіі і Беларусі. Як і 65 гадоў назад нашы краіны аб'ядноўвае Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, юбілей якой мы адсвяткавалі літаральна напярэдадні паездкі ў Мінск. Мы ганарымся землякамі — заўральцамі, якія абаранялі ад фашысцкіх захопнікаў беларускую зямлю, сярод іх — Герой Савецкага Саюза Бязрукаў Філіп Іванавіч, пахаваны ў брацкай магіле вёскі Мікуліна Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. Пошукавая група ваенна-патрыятычнага клуба «Патрыёт» Курганскай вобласці вядзе збор звестак пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, чыё жыццё звязанае з нашай вобласцю. А перад ад'ездам у Мінск я атрымаў пісьмо ад клуба «Патрыёт», з якога даведаўся аб тым, што да 1928 года на заўральскай зямлі пражываў ваш зямляк — мінчанін Жыгароў Іосіф Сямёнавіч, які ў гады вайны стаў Героем Савецкага Саюза.

**Пытанні задаваў Барыс ЗАЛЕСКІ.**